# ЗАМЕСТ ЛЕТНІКА — ЗІМНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Яна адкрыта ў дзіцячым аздараўленчым летніку «Берастаўіцкі», які знаходзіцца непадалёку ад раённага цэнтра. Тут прапануюць сустрэцца не з традыцыйным Дзедам Марозам, а з беларускімі гаспадарамі зімы — Зюзяй і Завеяй. Мясцовы Бераст-Зюзя не дорыць падарункаў, затое прапануе выпрабаваць сябе і перамагчы абставіны.**



Фота beresta.by.

Рэзідэнцыя ў дзіцячым летніку працуе другі год. Праект запусцілі летась, можна сказаць, у эксперыментальным рэжыме — працавалі толькі па заяўках. Але для адзіночных наведвальнікаў такі варыянт аказаўся нязручным — трэба было чакаць, каб сфарміравалася група. Сёлета ідэю падправілі і вырашылі вызначыць для прадстаўленняў пэўны час. Так і зрабілі. Цяпер анімацыйная праграма ідзе двойчы ў дзень аж да старога Новага года.

— Мы сустрэлі падтрымку ад раённай улады, — расказвае **намеснік дырэктара Бераставіцкага цэнтра культуры і народнай творчасці Юрый ЗАЯЦ.** — Больш за тое, прапанова засяліць рэзідэнцыю не Дзедам Марозам, а беларускім уладаром зімы Зюзяй, таксама прыйшла ад кіраўніцтва раёна. Так летнік набыў новы статус і незвычайных міфалагічных персанажаў.

Ролю Бераст-Зюзі ўзяў на сябе сам Юрый Заяц. Увогуле, справа для яго звыклая, шмат гадоў ён выступаў у ролі Дзеда Мароза. Але аказалася, што новы персанаж даволі эксцэнтрычны. Напрыклад, згодна з паданнем, ён ходзіць босы і носіць булаву замест посаха.

— Зюзя — гэта не Дзед Мароз, хоць таксама даволі сталы, з белай барадой, але адзеты значна прасцей — у звычайным сялянскім кажушку, са стужкай на валасах, і, што самае незвычайнае, з босымі нагамі. У такім стане мне прыйшлося летась адкрываць рэзідэнцыю, праўда, у лёгкім абутку, — жартуе Юрый.

Свайго героя не прыйшлося доўга шукаць. Дастаткова толькі пазнаёміцца з беларускай міфалогіяй. А тут вам і Дамавік, і Лазнік, і Лесавік, і Ваструха, і Хлеўнік, і Балотнік, і Злыдні... Знайшоўся і ўладар зімы — Зюзя. Каб яго задобрыць, беларусы на калядны першую лыжку куцці кідалі яму ў акно, прасілі мароз сцішыцца.

Для забаў на тэрыторыі рэзідэнцыі абсталявана шэсць пляцовак, на якіх сустракаюць самыя розныя міфалагічныя персанажы з гаспадыняй Завеяй. Галоўны нумар праграмы — калядны фэст. Адным з выпрабаванняў стала хада на лыжах. Некаторыя добра спраўляюцца нават без снегу. У рэзідэнцыі частуюць гарачымі стравамі — юшкай і кашай, гарачым чаем.

— Сёлета мы робім акцэнт на міфалогію — злыя і добрыя духі. Калі ўсе выпрабаванні пройдзены, дзеці ідуць да Зюзі, ён іх віншуе, і яны ўжо могуць атрымаць на Новы год падарункі, бо заслужылі іх, — тлумачыць Юрый Заяц.

Ці зразумелі дзеці новага персанажа? Па словах **начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Берастаўіцкага райвыканкама Алены ІГНАТОВІЧ**, дзяцей трэба зацікавіць. Тады ўсё атрымаецца. Напрыклад, беларускага зімніка Зюзю спрабавалі ўкараніць у сваёй праграме на папулярнай гродзенскай турыстычнай базе, але ідэя не прыжылася, і ад гэтага персанажа адмовіліся. У Берастаўіцы вырашылі, наадварот, гэту тэму ўдасканаліць, а сам персанаж зрабіць традыцыйным для свайго рэгіёна. Бо, сапраўды, Дзедаў Марозаў і так хапае, а вось Бераст-Зюзя — адзін такі на ўсю Гродзенскую вобласць.

— Мы правялі шырокую інфармацыйную кампанію, — паведаміла Алена Ігнатовіч. — У школы накіравалі пісьмы для дзяцей ад Бераст-Зюзі і Завеі з запрашэннем наведаць рэзідэнцыю. Гэта вельмі прыгожа аформленыя канверты. У пісьме расказваецца аб тым, хто такі Зюзя. Бо Дзеда Мароза ўсе ведаюць, а вось міфалагічны Зюзя, які між тым з'яўляецца беларускім зімнікам, амаль невядомы. Да таго ж ён не канкурэнт Дзеду Марозу, бо не кладзе падарункі пад ёлку, таму Дзед Мароз у гэтым сэнсе будзе мець перавагу, затое Зюзя можа замарозіць час, і Новы год не прыйдзе, калі ім грэбаваць. Менавіта такая ідэя ляжыць у аснове наваговняга квэста.

Ужо зараз у райвыканкаме адзначаюць высокі попыт на анімацыйную праграму ў незвычайнай зімовай рэзідэнцыі. Сюды наведваюцца як мясцовыя школьнікі, так і з суседніх раёнаў. Зручна і для турыстаў — рэзідэнцыя знаходзіцца якраз на шляху да Белавежскай пушчы.

Аддзел рамёстваў падрыхтаваў адпаведныя сувеніры. Іх можна набыць за сімвалічную цану ці выйграць у латарэю. Цацкі на ёлцы таксама незвычайныя, яны зроблены з прыродных матэрыялаў. Прычым удзел у гэтым прымалі і дарослыя, і дзеці. Усё зроблена сваімі рукамі. Выстаўка-кірмаш так і называецца — «Саматробны цуд». Як адзначылі арганізатары, у рэзідэнцыі хацелася паказаць як мага паўней нашу беларускую этнічную культуру. А ў нечым — з іншага боку. Уся анімацыйная праграма вядзецца на беларускай мове.

Дарэчы, Бераст-Зюзя і Завея не сядзяць бязвылазна ў сваёй рэзідэнцыі. У навагоднюю ноч яны прыйдуць на гарадскую плошчу, каб разам з усімі святкаваць прыход Новага года.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Разумны дом для жывёлы і чароўныя маршруты

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Навучэнцы Артур Царыковіч і Анастасія Крыўленя са Слуцкага раёна з праектам Phone Paint Detector стварылі праграму PPD, якая дазваляе карыстальнікам атрымаць усю інфармацыю пра карціны ў музеях, што іх цікавіць, без выкарыстання QR-кодаў, метак, аўдыягідаў. На сервер супрацоўнікі музея, галерэі дадаюць выяву карціны з яе апісаннем. З дапамогай праграмы можна ўвайсці ў базу даных зрабіць здымак і атрымаць расказ аб карціне.

Аўтарскую распрацоўку «Камп'ютарная гульня патрыятычнай накіраванасці «Знакамітыя спартсмены Беларусі» прадставіў вучань 9 класа сярэдняй школы № 3 горада Крупкі Мацвей Лебедзеў. Гульня-віктарына складаецца з пяці тураў і створана ў аб'ектна арыентаваным асяроддзі праграмавання Delphi. Яе можна праводзіць ва ўстановах сярэдняй, спартыўнай адукацыі, выкарыстоўваць на школьных раённых, абласных алімпіядах. Чаму тэматыка распрацоўкі — менавіта спартсмены Беларусі і іх дасягненні?

— Мне 15 гадоў, а маладыя людзі ў такім узросце пачынаюць думаць, з каго браць прыклад. Я са сваімі сябрамі вырашыў раўняцца на спартсменаў. Менавіта яны штодзённымі ўпартымі трэніроўкамі дабіваюцца высокіх вынікаў. І я хачу паказаць людзям, што ўсім ахвотным можна дасягнуць вяршынь.

— Гэтая гульня — працяг праекта «Беларусь спартыўная», якая на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Патрыёт.by» атрымала Дыплом ІІ ступені, — удакладняе кіраўнік праекта Вольга Азадоева. — Гэта — камп'ютарная версія гульні. Спыніліся на такім варыянце таму, што цяпер у школах карыстанне мабільнымі тэлефонамі абмежавана. Перавага яго ў тым, што дзеці могуць сабрацца разам за камп'ютарам, пагуляць і задумацца, каго выбраць сваім ідэалам — Кацярыну Карстэн, Дар'ю Домрачаву ці некага іншага. Часта кумірамі маладых людзей становяцца блогеры, рэперы і так далей. А мы хочам паказаць, што павінны знаходзіць героя ў сярод сваіх спартсменаў. Не абавязкова, што ты будзеш спартсменам, але мэтанакіравана, як і яны, трэба імкнуцца дасягнуць нейкіх вынікаў.

Акрамя таго, юны вынаходнік са сваім кіраўніком ствараюць яшчэ і мабільную версію гульні.

## АДХОДЫ — РЭАЛЬНЫЯ ДАХОДЫ

У Паліны Чарапан з Вілейскай школы № 1 — сацыяльны праект «Чароўныя маршруты». Ён мае на мэце дапамогу пажылым людзям, дзецям-інвалідам, сіротам, уразлівым катэгорыям грамадзян.

— Мы наведваем інтэрнаты для састарэлых, інвалідаў, дзяцей, бальніцы, сем'і, дзе выхаванцы знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Сваім падапечным уручаем падарункі, ладзім для іх розныя мерапрыемствы, віншуем са святамі. Лічым, што валанцёрства вельмі неабходнае ў нашым грамадстве, бо ў ім шмат людзей, якія маюць патрэбу ў падтрымцы, — упэўнена Паліна.

Гэты праект ужо апрабаваны на практыцы і паказаў сваю эфектыўнасць. Бо тут паміж яго ўдзельнікамі размеркаваны канкрэтныя абавязкі. Напрыклад, у кожнай групы — свой маршрут. Група «Далонькі» шэфствуе над дзецьмі, «Белы голуб» — над пацыентамі бальніцы сястрынскага догляду. А работу кожнай з іх накіроўвае і каардынуе куратар.

«Адходы — гэта рэальныя даходы», — лічыць Юлія Гапановіч з аграгарадка Грыцкевічы Нясвіжскага раёна. Дзяўчынка разам са сваім кіраўніком — настаўнікам хіміі і біялогіі Андрэем Радаманам прадэманстравалі аднайменны праект. Тандэм распрацаваў метад па ператварэнні тарфянога попелу ў электраліт і з дапамогай акумулятара — у крыніцу энергазабеспячэння. Яны плануюць укараніць сваё вынаходніцтва ў вытворчасць. У аграгарадку працуе кацельня на мясцовым паліве. І перапрацаваныя тарфяныя адходы гурвасцяцца каля будынка. Гэта непрыгожа, не лепшым чынам уздзейнічае на навакольнае асяроддзе.

Вёска старэе, вымірае, выпускнікі пасля заканчэння школы ад'язджаюць у горад. Як спыніць гэты працэс, задумаліся ў Лядскім дзіцячым садзе — сярэдняй школе Чэрвеньскага раёна. І вырашылі заняцца сельскай гаспадаркай, каб на асабістым прыкладзе паказаць, што гэта прыбытковая справа.

— На ўчастку мы вырошчваем экалагічна чыстую прадукцыю, вучым гасцей, як атрымліваць багаты ўраджай, асвойваем і новыя культуры. Мы плануем на базе школы стварыць адукацыйную пляцоўку, дзе будуць праводзіць заняткі спецыялісты па арганічным земляробстве. А мы станем ім дапамагаць, паказваць майстар-класы для насельніцтва. Думаю, гэтая ідэя мае вялікі эканамічны эфект для Беларусі і вырашае праблему замацавання моладзі на вёсцы, прыцягнення людзей да адкрыцця малога і сярэдняга бізнесу на сяле, — упэўнены кіраўнік праекта Ірына Жаваранкава і яе падапечныя Аляксандра Пяхота, Паліна Соніч і Яна Ігнатовіч.

## ЕЖА БУДУЧАГА

Ульяна Аскальдовіч з Дзераўнянскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна прадставіла праект «Стварэнне інтэрактыўнай карты і тапонімаў аграгарадка Дзераўная і яго ваколіц». Ён увабраў у сябе некалькі прадметаў — геаграфію, гісторыю, часткова беларускую мову, інфарматыку. Матэрыялаў для стварэння карты было не надта шмат, прызнаецца Ульяна. Дзякуючы літаратурнаму музею, што дзейнічае ў школе, апытанню мясцовых жыхароў, удалося сабраць звесткі пра гісторыю, культуру, традыцыі, быт мясцовасці.

— Ідэя стварэння праекта належыць педагогам і вучням школы, што вельмі актуальна ў Год малой радзімы, — кажа настаўніца гісторыі і геаграфіі Таццяна Арленка. — Такой карты, думаю, няма ва ўстановах адукацыі краіны. Таму да гэтай работы могуць далучыцца ўсе ахвотныя.

Ну а салігарчане, якія прымалі гасцей, прэзентавалі праект Аляксандра Карабко «Future food — ежа будучага». Юны вынаходнік прапануе спрасціць заказ страў і ўзаемадзеянне кліента з персаналам у рэстаранах і выводзіць заказ на новы ўзровень абслугоўвання. Кліент з дапамогай сканавання QR-кода зможа ўбачыць 3D-выяву ежы і вагу порцыі. У выніку, калі наведвальнік упершыню ўбачыць у меню пэўную назву стравы, ён зможа разабрацца, што гэта такое, без афіцыянта. З дапамогай праграмы можна таксама рабіць заказы з дастаўкай, атрымліваць інфармацыю пра рэстараны.

**«Мы плануем на базе школы стварыць адукацыйную пляцоўку, дзе будуць праводзіць заняткі спецыялісты па арганічным земляробстве. А мы станем ім дапамагаць, паказваць майстар-класы для насельніцтва».**

Традыцыйна інавацыйныя праекты і распрацоўкі ацэньваў экспертны савет, куды ўвайшлі прадстаўнікі выканаўчай улады, упраўлення адукацыі, грамадскіх арганізацый, спецыялісты цэнтра тэхнічнай творчасці Салігорска і «Беларуськалія». Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі падарункі. Найлепшыя праекты будуць прадстаўлены ў рэспубліканскім конкурсе.

Дадам, праект «100 ідэй для Беларусі» з'яўляецца базавым стартапам для развіцця нацыянальнага руху маладых вучоных, вынаходнікаў, рацыяналізатараў. Гэта выдатная магчымасць заявіць пра сябе на ўсю краіну, атрымаць дапамогу ў развіцці і суправаджэнні аўтарскага праекта.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**